**Юлія Вягера**

# Плач маленькай душы

*Мары няясныя, няпэўныя,*

*але яны клічуць. Нястрымна.*

Іван Мележ

"…Калі б каго-колечы з нашых Даніла навучыў, той добрым словам успамінаў бы, як бацьку роднага шанаваў. А то ад пані з двара пахвальбы чакаў. Не туды заехаў!" Так гаварылі суседзі…

Але не ведалі суседзі, што, апрача жонкі Аўдоцці, ёсць усё-такі на свеце адна жывая душа, якая ўспамінала добрым словам ужо нябожчыка Данілу. І гэтаю маленькаю душою быў сямігадовы хлопчык Хведзька, які стаяў наводдаль ад бацькоў і іншых вяскоўцаў, што сабраліся правесці ў апошні шлях старога бондара. Шчырыя слёзкі дробнымі гарошынкамі каціліся па кірпатаму дзіцячаму тварыку і хаваліся за каўняром кашулі. Не хацеў хлопчык, каб хто-небудзь бачыў яго гора па амаль чужому для яго чалавеку, бо і сам добра не ведаў, што гэта з ім адбываецца.

Хлопчык, як і іншыя жыхары вёскі, недалюбліваў і нават крыху пабойваўся заўсёды сур'ёзнага, а часамі і хмурага іх суседа Данілу. Не, стары ніколі не крыўдзіў яго. Ён, здаецца, нават ніколі і не заўважаў хлопчыка, калі сустракаўся з ім на вуліцы, бо заўсёды быў нейкі маўклівы і задуменны. Але Хведзька памятае яго позірк, калі ўсё-такі даводзілася сустракацца вачыма: нейкі пранізлівы, такі, што прабірае цябе наскрозь, што, здаецца, бачыць у табе нешта такое, патаемнае, чаго ты сам пра сябе яшчэ і не ведаеш. І тады хацелася хутчэй схавацца ад вачэй гэтага незразумелага яму чалавека. Дык чаму ж цяпер нейкі жаль сціскае яго маленькае сэрца? Чаму нешта гарачае падымаецца з яго грудзей, даходзіць да вачэй – і вачам становіцца так балюча, што слёзы самі цякуць па яго твары?

Добра памятае хлопчык і той апошні раз, дзесьці яшчэ з год назад, калі ўвязаўся ён за маці, што па нейкай сваёй жаночай патрэбе зайшла да Аўдоцці. Гэта быў ужо не першы раз, калі хопчык трапляў у хату да суседзяў, бо маці не раз пасылала яго да іх з рознымі даручэннямі. І Хведзька стараўся хутчэй выканаць гэтыя даручэнні, бо яму, як і заўсёды, няёмка было знаходзіцца пад пільным позіркам старога Данілы. Як ні стараўся хлопчык не глядзець па баках хаты, але цікаўны

позірк усё роўна кожны раз выхопліваў то пузаты бок ночваў, што прымасціліся ў кутку ля дзвярэй, то новенькія вёдры, што, як павы, расселіся на лаве, то яшчэ нейкія незакончаныя вырабы, добра вядомыя, пэўна, толькі аднаму бондару. Хведзька яшчэ ніколі не бачыў суседа за работай, хоць і чуў, што ў Данілы залатыя рукі і ён майстар – якога толькі пашукаць. Але на гэты раз яны з маці засталі бондара за працай. Гэта было так нязвыкла нават і для маці, што яны ўдваіх застылі ля парога, баючыся прамовіць нават словы прывітання. Лава, на якой звычайна стаяў зроблены посуд, была завалена кавалкамі нейкіх дрэў, дошак і нават пален. Аўдоцця з нязвыкла прасветленым тварам падавала мужу кавалкі дрэва, а той беражліва браў іх, “пераглядаў, перамацваў”, нават “пробаваў на язык”. Хведзька ў захапленні не мог адарваць вачэй ад постаці майстра. Яму на нейкі момант падалося, што Даніла зараз загаворыць з гэтымі звычайнымі кавалкамі дрэва, а то і зусім пачне маліцца ім. Вочы бондара былі крыху прыжмураны, і здавалася, што глядзіць ён не на кавалак дрэва, а скрозь яго, і бачыць там нешта незвычайнае, толькі аднаму яму зразумелае. І, напэўна, нешта чароўнае, бо твар старога майстра свяціўся ад нейкай затоенай радасці. І ў гэты час ён сам быў падобны да святога на адным з тых абразоў, што віселі ў іхняй хаце над сталом і на якія маці заўсёды малілася перад ядой і сном.

А які пах стаяў у хаце! Нос казытаў салодкі пах ліпы і гаркаваты водар асіны, а таксама туды прымешваўся асвяжальны, непаўторны водар сасны. Можна было толькі гадаць, колькі розных пахаў змяшалася тут. Быццам і не хата зусім, а нейкае дзіўнае месца, дзе адбываюцца розныя цуды!

У Хведзькі на нейкі момант спынілася сэрца, а потым затухкала, загрукацела з новай сілай, і хлопчыку падалося, што ўсе прысутныя ў хаце чуюць гэты грукат і зараз азірнуцца на яго. А гэтага нельга рабіць, бо цуд, які адбываўся перад яго вачыма, знікне. Здалося яму на хвілінку (хіба ж можа быць такое?!), што глядзіць ён на гэтыя кавалак дрэва, што трымае зараз Даніла, і бачыць перад сабой драўляную лыжку з незвычайным узорам на ручцы. А вось гэтае невялікае паленца ператварылася ў зграбную місачку, а вунь з той дошчачкі можа атрымацца прыгожы драўляны куфэрак… Хлопчык не разумеў, што з ім адбываецца. Гэта было проста нейкае дзіва.

Але вось маці прывіталася з суседзямі – і цуд знік. Бондар паклаў кавалак дрэва на стол і строга зірнуў на іх з маці. Праўда, ён нічога не сказаў, але няёмка зрабілася не толькі хлопчыку, а і маці, бо тая ведала, што сусед не любіць працаваць, калі на яго работу глядзяць чужыя. Яна пра нешта папытала цётку Аўдоццю, якая адна адказала на прывітанне, і яны моўчкі выйшлі з хаты. Маці адразу пайшла дамоў, а Хведзька, яшчэ пад уражаннем убачанага, паціху пакрочыў на сваё любімае месца каля

ракі. Там, пад старою вярбою, галіны якой звісалі да самай зямлі і рабілі своеасаблівую хованку, яму добра думалася над сваімі малымі дзіцячымі праблемамі. І сёння яму таксама хацелася на адзіноце паразважаць над тым дзівам, што сёння з ім адбылося. Сваім маленькім сэрцам ён адчуваў, што ўбачанае сёння ў хаце суседа перавярнула нешта ў яго душы. Хлопчык разумеў, што зусім ужо другімі вачамі будзе цяпер глядзець на старога бондара, адчуваючы нейкую сувязь з ім і падзяляючы разам з ім дачыненне да незвычайнага, таямнічага. А яшчэ… Не, ён ведаў, што Даніла не бярэ вучняў. Але, можа, праз некалькі год, стары майстар перадумае, і тады Хведзька стане самым старанным вучнем на ўсім свеце! І самым удзячным! І самым лепшым! І ўжо ён сам будзе тварыць цуда, працуючы, здавалася б, з самымі звычайнымі кавалкамі дрэва!..

Коцяцца слёзкі па твары хлопчыка, і не здагадваецца той, што гэта плача яго душа, маленькая, шчырая. І плача не па нябожчыку Данілу. Яна сёння назаўсёды развітваецца са сваёй няйздзейсненай чароўнай марай, якую закапаюць ў труне разам са старым майстрам на могілках за вёскай.